***Адрас аргкамітэта:***

220007, Беларусь, Мінск,
вул. Рабкораўская, 17, БДУКМ;
тэл. +37517-2228062
факс +37517-2222409

УА «БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ»

Аргкамітэт XIII Міжнароднай навуковай канферэнцыі

**«Аўтэнтычны фальклор:**
**праблемы захавання, вывучэння, успрымання»**

Кантакты для сувязі:

Вячаслаў Калацэй
+37529-7543588 (GSM)
vietah@yandex.by

Кафедра этналогіі і фальклору
+37517-2228062 (стацыянарны)
+37517-2222409 (факс БДУКМ)
ethnoandfolk@gmail.com

За ходам падрыхтоўкі і правядзеннем канферэнцыі можна сачыць на афіцыйным сайце ўніверсітэта **buk.by**, на старонцы VK **https://vk.com/af_xiii**

*…Варта адзначыць, што канферэнцыя, канцэптуальна прысвечаная аўтэнтычнаму фальклору, безумоўна, магла з'явіцца толькі ва ўніверсітэце культуры і мастацтваў, які ад стварэння быў буйным цэнтрам тэорыі народнай культуры і сапраўдным крэатарам практычнай фалькларыстыкі Беларусі.*

Міністр культуры Рэспублікі Беларусь — Юрый Бондар

МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
**«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ»**

КАФЕДРА ЭТНАЛОГІІ І ФАЛЬКЛОРУ





праводзяць

XIII Міжнародную навуковую канферэнцыю

# «Аўтэнтычны фальклор:
## праблемы захавання, вывучэння, успрымання»

26-28 красавіка

Мінск 2019

## ІНФАРМАЦЫЙНЫ ЛІСТ

Шаноўнае спадарства!

Запрашаем вас прыняць удзел у рабоце XIII Міжнароднай навуковай канферэнцыі **«Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання»**

Работа канферэнцыі будзе праводзіцца на базе Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Статус БДУКМ як установы з трывалымі акадэмічнымі традыцыямі і сувязямі, якая дае рознабаковую гуманітарную адукацыю, забяспечвае канферэнцыі інтэгратыўны, антрапалагічны падыход да фальклору, які неабходны для яго захавання ва ўмовах глабалізацыйнага выкліку XXI стагоддзя. У межах канферэнцыі адбудуцца:

- пленарнае, секцыйныя і заключнае пасяджэнні;
- XVI этнаграфічны канцэрт «Фальклор беларускай глыбінкі»;
- майстар-класы вядучых спецыялістаў у галіне ўсходнееўрапейскага фальклору;
- канцэрт маладзёжных фальклорных гуртоў;
- экскурсія ў музей-скансэн

Плануецца работа секцый па напрамках:

Секцыя 1. Нематэрыяльная культурная спадчына і яе ахова.

Секцыя 2. Трансфармацыя відаў і жанраў аўтэнтычнага фальклору.

Секцыя 3. Семантыка і міфапаэтыка традыцыйнай абраднасці.

Секцыя 4. Традыцыйная культура ў кнізе, адукацыйнай прасторы і аўдыявізуальнай антрапалогіі.

Секцыя 5. Экалогія традыцыйнай мастацкай культуры.

Секцыя 6. Унёсак роду Луцкевічаў у вывучэнне і папулярызацыю фальклору (да 135-годдзя з дня нараджэння Івана Луцкевіча).

Секцыя 7. Праблемы спеўнай этнафоніі.

Секцыя 8. Праблемы арганалогіі і марфалогіі музычных інструментаў.

***Умовы ўдзелу ў канферэнцыі:***

жадаючым прыняць удзел у рабоце канферэнцыі неабходна даслаць электронную заяўку, тэкст даклада і копію квітка аб аплаце аргузносу да **2 красавіка 2019** года на адрас аргкамітэта

e-mail: ethnoandfolk@gmail.com

***Да пачатку работы канферэнцыі плануецца выданне зборніка навуковых прац* «Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання (памяці антраполага Зінаіды Мажэйкі)». *Аргкамітэт пакідае за сабой права адбору тэкстаў для публікацыі.***

***ЗАЯЎКА***

ўдзельніка XIII Міжнароднай навуковай канферэнцыі **«Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання»**

26-28 красавіка 2019, Мінск

Прозвішча ______________________________

Імя ______________________________

Імя па бацьку ______________________________

Пасада ______________________________

Поўная назва арганізацыі ______________________________

______________________________

Вучоная ступень, вучонае званне ______________________________

______________________________

Паштовы адрас арганізацыі ______________________________

______________________________

______________________________

Кантактны тэлефон, факс, e-mail ______________________________

______________________________

Тэма даклада ______________________________

______________________________

Неабходнасць афіцыйнага запрашэння ______________

Неабходнасць браніравання жылля ______________

(подпіс) (дата)

Арганізацыйны ўзнос на правядзенне канферэнцыі складае **25** беларускіх рублёў і пералічваецца на разліковы рахунак БДУКМ

***Разліковы рахунак у беларускіх рублях:***

*BY36 AKBB 3632 9630 9900 5540 0000*
*ЦБУ № 527 ОАО АСБ «Беларусбанк»,*
*г. Мінск, Варанянскага 7А, БИК AKBBBY2X*
*УНП 100286677*

*(з указаннем прозвішча і імя ўдзельніка з пазнакай: за ўдзел у канферэнцыі «Аўтэнтычны фальклор»).* УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», юрыдычны адрас г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17. *Пры складанасцях у аплаце (асабліва ўдзельнікаў з-за мяжы) просьба звяртацца ў аргкамітэт.*

- Праезд, пражыванне і харчаванне ўдзельнікі канферэнцыі аплачваюць самастойна.
- Рабочыя мовы: беларуская, руская, украінская, польская, англійская.

***Запрашэнне на канферэнцыю будзе выслана дадаткова.***

***Патрабаванні да афармлення тэкстаў дакладаў***

Матэрыялы дакладаў аб'ёмам да 5 поўных старонак фармату А4 (210 х 297мм) павінны быць набраны ў рэдактары Word (версія не ніжэй 6,0) для Windows праз 1,5 інтэрвал шрыфтам Times New Roman памерам 14 pt без пераносаў. Палі – 25 мм.

Першы радок: справа прозвішча (прозвішчы) і імя аўтара (аўтараў), у дужках горад, арганізацыя. Другі радок: праз інтэрвал назва даклада вялікімі літарамі па цэнтры. Трэці радок: праз інтэрвал друкуюцца тэзісы на мове даклада (да 160 знакаў) і іх пераклад на англійскую мову (да 160 знакаў). Праз інтэрвал друкуецца тэкст даклада.

Зноскі на літаратуру і крыніцы афармляюцца ў адпаведнасці з патрабаваннямі ВАК Беларусі.